І.У. Балуш,
начальнік аддзела вучэбна-метадычнага забеспячэння ўстаноў адукацыі сферы культуры ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Выкарыстанне нотных зборнікаў у сістэме дадатковай адукацыі дарослых

Немагчыма ўявіць музычную дзейнасць, пры ажыццяўленні якой не давялося б звяртацца да нотнага тэксту. Пры дапамозе нотных знакаў кампазітар стварае музычныя творы, выканаўца выконвае сачыненне кампазітара, хормайстар, робячы перакладанне для хору, пераўтварае зыходную нотную структуру галасоў у тэкст харавога твора, музыказнаўца аналізуе музычны твор, фалькларыст выконвае расшыфроўку ўзораў музычнага народнага мастацтва, захоўваючы іх на стагоддзі. Імправізацыя таксама ствараецца з апорай на арыгінальны нотны тэкст.

Распрацоўка і выданне нотных зборнікаў — адзін з напрамкаў дзейнасці Інбелкульта. Разам з іншымі ён забяспечвае рэалізацыю праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у сферы культуры. Штогод у Інбелкульце адукацыйную праграму асвойваюць звыш тысячы чалавек, большую частку якіх складаюць педагагічныя работнікі дзіцячых школ мастацтваў, выкладчыкі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, спецыялісты клубных устаноў — кіраўнікі студый, калектываў непрафесійнай (аматарскай) мастацкай творчасці.

За 25-гадовы перыяд, акрамя навуковай, навукова-папулярнай, даведачнай, інфармацыйна-аналітычнай, статыстычнай, вучэбна-метадычнай літаратуры, Інстытутам падрыхтавана і выдадзена больш за 130 найменняў нотных выданняў — рэкамендаваных і зацверджаных Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь рэпертуарных зборнікаў для прафесійных выканаўцаў і калектываў аматарскай мастацкай творчасці, вучэбных выданняў і нотных зборнікаў для выкарыстання ў адукацыйным працэсе.

У кантэксце патрабаванняў да арганізацыі і зместу адукацыйнага працэсу, пашырэння форм навучання, развіцця навукова-педагагічнага патэнцыялу нотныя выданні вызначаюць спецыфіку дзейнасці ўстановы, адлюстроўваюць асаблівасць навучання спецыялістаў сферы культуры і з'яўляюцца дыдактычнымі сродкамі навучання. Выкладчыкі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі, пры правядзенні практычных заняткаў выкарыстоўваюць іх, на лекцыях знаёмяць з навінкамі, робяць агляд і даюць рэкамендацыі па іх прымяненню.

Аўтары-складальнікі нотнай літаратуры, як правіла, — выкладчыкі Інбелкульта, якія прымаюць удзел у адукацыйным працэсе.

Прыярытэтным у выдавецкай дзейнасці з'яўляецца падрыхтоўка і выпуск твораў класікаў беларускай музычнай культуры і сучасных кампазітараў. У нотныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зборнікі, створаныя ў розны час, увайшлі разнастайныя па форме, жанрах, стылістыцы, вобразнаму зместу сачыненні А. Багатырова, П. Падкавырава, Л. Абеліёвіча, К. Цесакова, А. Туранкова, Я. Глебава, Д. Смольскага, Р. Суруса, В. Кузняцова, У. Дамарацкага, Г. Ермачэнкава, Г. Гарэлавай, Л. Шлег, В. Капыцько, У. Кур'яна і інш.

Кожная нацыянальная музычная культура мае непаўторнае гучанне. Унікальнасць музычнай мовы Беларусі вызначаецца галасамі яе нацыянальных інструментаў — цымбалаў, дуды, жалейкі, ліры і інш. У мэтах захавання і папулярызацыі беларускай народнай музыкі выдадзены зборнікі твораў для нацыянальных музычных інструментаў: «Гусляр. Зборнік твораў беларускіх кампазітараў для цымбалаў сола» [12]; У.М. Гром «Дударэньку-гаспадэньку» [11]; «Інструментальныя творы для ансамбляў народнай музыкі ў апрацоўцы М. Сіраты» [14]; «Серебряный звон. Пьесы для ансамбля цимбалистов» [30]; «Вяртанне да вытокаў. Зборнік канцэртных твораў для ансамбля цымбалістаў» [8] і інш.

Вакальная і харавая музыка ў нотных выданнях вылучаецца разнажанравасцю: «Нова радасць стала. Хрэстаматыя духоўнай харавой музыкі» [24]; Н. Гілевіч «Жаўраначка. Зборнік песень на музыку беларускіх кампазітараў» [9]; І. Лучанок «Цягнік дзяцінства. Зборнік песень для дзяцей і юнацтва» [19]; Я. Паплаўскі «Родныя вобразы. Кантата для змешанага хору на словы Янкі Купалы і Якуба Коласа» [28]; «"І песню родную люблю я..." З рэпертуару фальклорнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля "Валачобнікі"» [15]; С. Бярэжноў «Спявае народны хор. Апрацоўкі беларускіх народных песень» [7]; «Ляцеў сокал. Беларускія народныя песні ў апрацоўцы для хору без суправаджэння» [21]; «"Люблю наш край, старонку гэту…" Творы для ансамбля беларускай народнай песні» [20] і інш.

Асаблівае месца ў выдавецкай дзейнасці Інбелкульта займаюць нотныя выданні, прысвечаныя гістарычнаму мінуламу беларускага музычнага мастацтва. Для захавання, прыцягнення цікавасці да гісторыі айчыннай музычнай культуры вялася падрыхтоўка выданняў, сярод якіх першым стаў зборнік інструментальнай музыкі XIX ст. «Помнікі музычнай культуры Беларусі» [29].

У рамках праграмы «Адраджэнне старажытнага музычнага мастацтва Беларусі» ў 1998 г. выйшлі чатыры выданні: Міхал Клеафас Агінскі «Танцавальная сюіта для камернага аркестра» [4] і «Творы для камерных ансамбляў» [5]; Міхал Казімеж Агінскі «Шэсць п'ес з вакальнага цыкла "Да Касі"» [3], Восіп Казлоўскі «Творы для камерных ансамбляў» [16].

Творы знакамітага кампазітара, піяніста, мастака XIX ст. Напалеона Орды, жыццё і творчасць якога звязаны з Беларуссю, увайшлі ў шэраг нотных выданняў з серыі нотных зборнікаў «Беларускія кампазітары XIX стагоддзя»: «Творы для фартэпіяна» [27], «Вальсы» [25] і «Паланэзы» [26].

Выданні з серыі «Музычная спадчына Рэчы Паспалітай з Расійскай нацыянальнай бібліятэкі» абагульняюць шматгадовую працу ў архівах і фондах аўтара-складальніка Я. Паплаўскага і прадстаўлены нотнымі зборнікамі: «Усяношнае





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чуванне Давыдкаўскага ірмалагіёна» [33]; «Танец і вобраз у музыцы XIX стагоддзя. Творы для фартэпіяна» [31]; Юзаф Крашэўскі, Каятан Крашэўскі «Творы для фартэпіяна» [17]; Антон Абрамовіч «Фантазія для фартэпіяна» [2]; Канстанцін Горскі «Сакральныя творы» [10]; «Абразкі мінулага. Творы для фартэпіяна» [1]; Юзаф Дашчынскі «Паланэзы» [13]; «Музычная спадчына Юзафа Ігнацыя і Каятана Крашэўскіх. Творы для фартэпіяна» [23].

Нотныя выданні, прысвечаныя беларускай музычнай мінуўшчыне, выконваюць місію асветы, з'яўляючыся своеасаблівай анталогіяй беларускай музычнай культуры XVIII — XIX стст. Яны знаёмяць з фактамі з біяграфій кампазітараў і асноўнымі перыядамі іх творчасці, а выкарыстаныя ў іх афармленні малюнкі, гравюры, факсімільныя копіі тытульных лістоў тагачасных выданняў узнаўляюць атмасферу гістарычнай эпохі.

У музычнай педагогіцы нотныя выданні — адзін з асноўных сродкаў навучання. Праца над нотным тэкстам дазваляе, паглыбіўшыся ў сутнасць мастацкай задумы аўтара, усвядоміць і перадаць змест музычнага твора, спрыяе стымуляванню цікавасці да пазнання і творчасці, развіццю творчага мыслення і ўяўлення, эмацыянальнай сферы, фарміруе кругагляд.

Супрацоўнікамі Інбелкульта рэалізаваны праекты па выпуску нотнай літаратуры для забеспячэння дзейнасці ўстаноў адукацыі сферы культуры — дзіцячых школ мастацтваў, устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі. З 2002 г. выходзіць серыя «Беларускія кампазітары — дзецям», у якой прадстаўлены вакальныя сачыненні і творы для шырокага спектра музычных інструментаў беларускіх аўтараў. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца тры выпускі рэпертуарнага зборніка «Музыкальный зоопарк» [22] для дзіцячых школ мастацтваў, у якія ўвайшлі творы беларускіх кампазітараў і інш.

Як вынік правядзення канферэнцый, семінараў і іншых мерапрыемстваў, накіраваных на выяўленне, абагульненне і распаўсюджванне педагагічнага вопыту вядучых педагогаў рэспублікі, выйшлі зборнікі: М.М. Алданаў «Хрестоматия педагогического репертуара для оркестров народных инструментов» [6]; «Хрэстаматыя па беларускай народнай музычнай творчасці» (метадычны дапаможнік для ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў; аўтар-укладальнік Л.В. Зыкава) [34]; Р.І. Целяпнёў «Веселые смычки» (дапаможнік для ансамбляў струнных смычковых інструментаў дзіцячых школ мастацтваў) [32]; І.Ф. Кузьміцкі «Тремоло на гитаре» (метадычны дапаможнік для дзіцячых школ мастацтваў) [18] і інш.

Такім чынам, можна адзначыць, што дзейнасць Інбелкульта па стварэнню нотных зборнікаў і выкарыстанню іх у адукацыйным працэсе ўстановы адукацыі вырашае важныя задачы: актывізуе засваенне слухачамі адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў; стварае магчымасці для актуалізацыі і пашырэння ведаў, прафесійнага кругагляду; забяспечвае неабходныя ўмовы для папулярызацыі і распаўсюджвання музычнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Абразкі мінулага : Творы для фартэпіяна / укл. Я. Паплаўскі. — Мінск, 2012. — 45 с.
2. *Абрамовіч, А.* Фантазія для фартэпіяна / А. Абрамовіч; укл. Я. Паплаўскі. — Мінск, 2009. — 42 с.
3. *Агінскі, М.Каз.* Шэсць п'ес з вакальнага цыкла «Да Касі» для камернага ансамля / М.Каз. Агінскі ; інстр. Г. Гедыльтэра. — Мінск, 1998. — 32 с.
4. *Агінскі, М.Кл.* Танцавальная сюіта для камернага аркестра / М.Кл. Агінскі ; інстр. Г. Гедыльтэра. — Мінск, 1998. — 38 с.
5. *Агінскі, М.Кл.* Творы для камерных ансамбляў / М.Кл. Агінскі ; інстр. Г. Гедыльтэра. — Мінск, 1998. — 80 с.
6. *Алданов, Н.М.* Хрестоматия педагогического репертуара для оркестров народных инструментов : учеб. пособие / Н.М. Алданов. — Минск, 2011. — 111 с.
7. *Бяражной, С.* Спявае народны хор : Апрацоўкі беларускіх народных песень / С. Беражноў. — Мінск, 2012. — 42 с.
8. Вяртанне да вытокаў : Зборнік канцэртных твораў для ансамбля цымбалістаў : вучэб. дапаможнік / укл. Я.П. Гладкоў. — Мінск, 2005. — 87 с.
9. *Гілевіч, Н.* Жаўраначка : Зборнік песень на музыку беларускіх кампазітараў / Н. Гілевіч; укл. У.П. Скараходаў. — Мінск, 1996. — 63 с.
10. *Горскі, К.* Сакральныя творы / К. Горскі; укл. Я. Паплаўскі. — Мінск, 2010. — 38 с.
11. *Гром, У.М.* Дударэньку-гаспадэньку / У.М. Гром. — Мінск, 1999. — 54 с.
12. Гусляр : Зборнік твораў беларускіх кампазітараў для цымбалаў сола / укл. Я.П. Гладкоў. — Мінск, 1997. — 41 с.
13. *Дашчынскі, Ю.* Паланэзы / Ю. Дашчынскі; укл. Я. Паплаўскі. — Мінск, 2013. — 46 с.
14. Інструментальныя творы для ансамбляў народнай музыкі ў апрацоўцы М. Сіраты / укл. І.І. Глабурды. — Мінск, 1999.
15. «І песню родную люблю я...» : З рэпертуару фальклорнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Валачобнікі» : вучэб.-метад. дапаможнік / укл. С.І. Дробыш, С.Ф. Войцік, Л.І. Холупава. — Мінск, 2008. — 176 с.
16. *Казлоўскі, В.* Творы для камерных ансамбляў / В. Казлоўскі; інстр. Г. Гедыльтэра. — Мінск, 1998. — 24 с.
17. *Крашэўскі, Ю., Крашэўскі, К.* Творы для фартэпіяна : вучэб.-метад. дапаможнік / Ю. Крашэўскі, К. Крашэўскі; укл. Я. Паплаўскі. — Мінск, 2009. — 67 с.
18. *Кузьмицкий, И.Ф.* Тремоло на гитаре : метод. пособие для детских школ искусств / И.Ф. Кузьмицкий. — Минск, 2012. — 37 с.
19. *Лучанок, І.* Цягнік дзяцінства : Зборнік песень для дзяцей і юнацтва / І. Лучанок. — Мінск, 1996. — 64 с.
20. «Люблю наш край, старонку гэту…» : Творы для ансамбля беларускай народнай песні : дапаможнік / укл. Л.І. Холупава., Г.Д. Несцяровіч, А.І. Дубавец. — Мінск, 2013. — 147 с.
21. Ляцеў сокал : Беларускія народныя песні ў апрацоўцы для хору без суправаджэння / укл. У. Радаліцкі. — Мінск, 2013. — 78 с.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

22. Музыкальный зоопарк : хрестоматия / сост. Л.М. Жукова. — Вып. 1. — Минск, 2006. — 147 с.; Вып. 2. — Минск, 2009. — 152 с.; Вып. 3. — Минск, 2012. — 123 с.
23. Музычная спадчына Юзафа Ігнацыя і Каятана Крашэўскіх : Творы для фартэпіяна / укл. Я. Паплаўскі. — Мінск, 2012. — 67 с.
24. Нова радасць стала : Хрэстаматыя духоўнай харавой музыкі / укл. А.В. Пякуцька, З.Л. Леаноіч, В.П. Маеўская. — Мінск, 1995. — 60 с.
25. *Орда, Н.* Вальсы / Н. Орда; укл. Я. Паплаўскі. — Мінск, 2007. — 64 с.
26. *Орда, Н.* Паланэзы / Н. Орда; укл. Я. Паплаўскі. — Мінск, 2007. — 80 с.
27. *Орда, Н.* Творы для фартэпіяна / Н. Орда; выкан. рэд. І.У. Алоўнікава. — Мінск, 1997. — 52 с.
28. *Паплаўскі, Я.* Родныя вобразы : Кантата для змешанага хору на словы Янкі Купалы і Якуба Коласа : вучэб.-метад. дапаможнік / Я. Паплаўскі. — Мінск, 2008. — 40 с.
29. Помнікі музычнай культуры Беларусі / укл. А.І. Ахвердава. — Мінск, 1993. — 52 с.
30. Серебряный звон : Пьесы для ансамбля цимбалистов / сост. Т.П. Сергеенко. — Минск, 2004. — 88 с.
31. Танец і вобраз у музыцы XIX стагоддзя : Творы для фартэпіяна : вучэб.-метад. дапаможнік / укл. Я. Паплаўскі. — Мінск, 2008. — 56 с.
32. *Телепнёв, Р.И.* Веселые смычки : пособие для ансамблей струнных смыч. инструментов детских школ искусств / Р.И. Телепнёв. — Минск, 2012.
33. Усяношнае чуванне Давыдкаўскага ірмалагіёна (канец XVII — пачатак XVIII ст.) для змешанага хору без суправаджэння : вучэб.-метад. дапаможнік / укл., расшыфр. і адаптацыя літ. тэксту Я. Паплаўскага. — Мінск, 2008. — 35 с.
34. Хрэстаматыя па беларускай народнай музычнай творчасці : метад. дапаможнік для ўстаноў сярэд. спец. адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў / аўт.-укл. Л.В. Зыкава. — Мінск, 2012. — 208 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ